# Узроставая перыядызацыя псіхічнага развіцця чалавека

Тэма лекцыі




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# План лекцыі:

- 1. Паняцце аб крытэрыях узроставай перыядызацыі псіхічнага развіцця. Л.С.Выготскі аб крытэрыях узроставай перыядызацыі
- 2. Сацыяльная сітуацыя развіцця, вядучая дзейнасць і псіхалагічныя новаўтварэнні - крытэрыі ўзроставай перыядызацыі
- 3. Крызісы развіцця. Праблема стабільных і крытычных перыядаў развіцця ў тэорыі Л.С.Выготскага
- 4. Параўнальны аналіз узроставых перыядызацый псіхічнага развіцця чалавека розных аўтараў
- 5. Схема ўзроставай перыядызацыі псіхічнага развіцця дзіцяці ў тэорыі Д.Б.Эльконіна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Узроставая перыядызацыя -** перыядызацыя этапаў у жыцці чалавека і вызначэнне ўзроставых межаў гэтых этапаў, прынятая ў грамадстве сістэма ўзроставай стратыфікацыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Крытэрый*** - прызнак, падстава, правіла прынящця рашэння па ацэнцы чаго-небудзь на адпаведнасць прад'яўленым патрабаванням.

***Крытэрый*** — гэта прызнак, на падставе якога адбываецца ацэнка, вызначэнне або класіфікацыя чаго-небудзь.

***Крытэрый узроставай перыядызацыі*** — прызнак, які адлюстроўвае істотныя асаблівасці самога працэсу развіцця і з'яўляецца паказчыкам узроставых змяненняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Тры групы крытэрыяў узроставай перыядызацыі згодна Л.С.Выготскаму

1

- **Знешні крытэрый**
- 1. Біягенетычны прынцып (К.Гетчынсан, У.Штэрн)
- 2. Ступені сістэмы адукацыі (Р.Заззо)

2

- **Унутраны крытэрый**
- 1. Дэнціцыя (П.П.Блонскі)
- 2. Эрагенныя зоны (З.Фрэйд)

3

- **Унутраныя змены самога псіхічнага развіцця**
- 1. Сацыяльная сітуацыя развіцця, псіхалагічныя новаўтварэнні, крызісы развіцця (Л.С.Выготскі)
- 2. Вядучая дзейнасць (А.М.Лявонцьеў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Знешні крытэрый

Біягенетычны прынцып(К.Гетчынсан)

| Стадыя | Узрост |
|---|---|
| стадыя капання | 0-5 гадоў |
| стадыя палявання і захопу | 5-8 гадоў |
| стадыя пастуха | 8-12 гадоў |
| земляробчая стадыя | 12-14 гадоў |
| стадыя прамысловасці і гандлю (сучаснага чалавека) | 15 гадоў і далей |

Ступені сістэмы адукацыі(Р.Заззо)

| Стадыя | Узрост |
|---|---|
| ранняе дзяцінства | 0-3 гадоў |
| дашкольнае дзяцінства | 3-6 гадоў |
| пачатковая школьная адукацыя | 6-12 гадоў |
| навучанне ў сярэдняй школе | 12-16 гадоў |
| вышэйшая і універсітэцкая адукацыя | 16 гадоў и далей |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Унутраны крытэрый

Дэнціцыя (П.П.Блонскі)

| Стадыя | Узрост |
|---|---|
| Бяззубае дзяцінства | 0-2 гады |
| Малочназубае дзяцінства | 2-6 гадоў |
| Пастаяннназубае дзяцінства | 6 -18-20 гадоў |

Эрагенныя зоны (З.Фрэйд)

| Стадыя | Узрост |
|---|---|
| Аральная | 0-1,5 гадоў |
| Анальная | 1,5-3 гадоў |
| Фалічная | 3-6 гадоў |
| Латэнтная | 6-12 гадоў |
| Генітальная | 12-18 гадоў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**САЦЫЯЛЬНАЯ СІТУАЦЫЯ РАЗВІЦЦЯ (Л.С. Выготскі)** – гэта асаблівае спалучэнне ўнутраных працэсаў развіцця і знешніх умоў, якое з'яўляецца тыповым для кожнага ўзроставага этапу, якое вызначае дынаміку псіхічнага развіцця на працягу адпаведнага ўзроставага перыяду і якасна своеасаблівыя псіхалагічныя новаўтварэнні, што ўзнікаюць ў канцы гэтага перыяду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Сацыяльная сітуацыя развіцця (Л.С.Выготскі, Л.І.Бажовіч)

### *Аб'ектыўны аспект*

- Месца асобы ў сістэме сацыяльных адносін; уключае ў сябе розныя аб'ектыўныя сферы ўзаемаадносін асобы з соцыумам (Выготскі)
- Пэўнае месца ў сістэме даступных дзіцяці грамадскіх адносін, якія характарызуюцца вядомай сістэмай правоў і абавязкаў дзіцяці, пэўнымі патрабаваннямі да яго паводзін і дзейнасці, пэўнымі сацыяльнымі чаканнямі і санкцыямі (Бажовіч)

### *Суб'ектыўны аспект*

- **Унутраная пазіцыя** асобы, якая звязана з развіццём самасвядомасці і самаацэнкі, а таксама перажываннем сваіх адносін (Выготскі)
- **Ўнутраная пазіцыя** дзіцяці, якая адлюстроўвае яго стаўленне да ўласнай аб'ектыўнай сацыяльнай пазіцыі, пераломленае праз уласную сістэму патрэбаў і матываў (Бажовіч)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Унутраная пазіцыя** (Л.І. Бажовіч) - сістэма ўнутраных фактараў, праз якую пераламляюцца і апасрэдуюцца ўздзеянні асяроддзя і якая вызначае тое, як дзіця ставіцца да сваёй аб'ектыўнай пазіцыі ў грамадстве, якую ён фактычна займае ці хацеў бы займаць.





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Вядучая дзейнасць** (А.М. Лявонцьеў) - дзейнасць, выкананне якой вызначае ўзнікненне і фарміраванне асноўных псіхалагічных новаўтварэнняў чалавека на пэўнай стадыі псіхічнага развіцця.

- ***Па-першае***, гэта такая дзейнасць, у форме якой узнікаюць і ўнутры якой дыферэнцыюцца іншыя, новыя віды дзейнасці.
- ***Па-другое***, гэта такая дзейнасць, у якой фарміруюцца ці перабудоўваюцца прыватныя псіхічныя працэсы.
- ***Па-трэцяе***, гэта такая дзейнасць, ад якой бліжэйшым чынам залежаць адзначаемыя ў дадзеным ўзросце асноўныя змены асобы дзіцяці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Віды вядучай дзейнасці

- Непасрэдныя эмацыянальныя зносіны дзіцяці з дарослымі
- Прадметна-маніпулятыўная дзейнасць
- Сюжэтна-ролевая гульня
- Вучэбная дзейнасць
- Зносіны падлеткаў з аднагодкамі
- Вучэбна-прафесійная дзейнасць
- Прафесійная (працоўная) дзейнасць
- Унутраная (рэфлексіўная) дзейнасць, накіраваная на прыняцце свайго жыццёвага шляху

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Псіхалагічныя новаўтварэнні - гэта:

— **па-першае,** псіхічныя і сацыяльныя змены, якія ўзнікаюць на дадзенай ступені развіцця і вызначаюць свядомасць дзіцяці, яго стаўленне да асяроддзя, ўнутранае і знешняе жыццё, ход развіцця ў дадзены перыяд;

— **па-другое,** абагульнены вынік зменаў, усяго псіхічнага развіцця дзіцяці ў адпаведны перыяд, які становіцца зыходным для фарміравання псіхічных працэсаў і асобы дзіцяці ў наступным ўзросце (Выготскі Л.С.).

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

# Працэс псіхічнага развіцця




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Крызіс (ад грэч. krisis)** – «рашэнне, паваротны пункт, зыход, суд», гэта значыць, рэзкі, круты пералом у ходзе якога-небудзь працэсу, які змяняе яго форму, напрамак а таксама кропка выбару, якая перакрэслівае нешта ў мінулым.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Крызісы (Э.Ф. Зеер)

- ***Нарматыўныя*** – неабходныя для нармальнага, паступальнага ходу асобаснага развіцця (крызісы псіхічнага развіцця ў дзяцінстве і крызісы прафесійнага развіцця ў сталасці)
- ***Ненарматыўныя*** - носяць верагоднасны або неўратычны характар, абумоўлены рознымі псіхічнымі зменамі: «перабудова свядомасці, несвядомыя ўражанні, інстынкты, ірацыянальныя тэндэнцыі - усё, што спараджае ўнутраны канфлікт, разузгадненне псіхалагічнай цэласнасці»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# А.М. Лявонцьеў вылучаў

- **Крызіс** - негатыўная з'ява, сведчанне, незавершанага своечасова пераходу;
- негатыўнае ўспрыманне асобай рэвалюцыйных змяненняў

- **Крытычны перыяд** - непазбежны пераход з адной стадыі развіцця на іншую, звязаны з якаснымі зменамі ў развіцці;
- адлюстроўвае сутнасць працэсу развіцця, які складаецца з адносна стабільных і, парушаючых стабільнасць, перыядаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Э. Эрыксан***

**Крызіс** - непазбежны паваротны пункт, крытычны момант у развіцці, «пасля якога развіццё паверне ў той ці іншы бок, выкарыстоўваючы магчымасці росту, здольнасць да акрыяння і далейшай дыферэнцыяцыі».



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Віды перыядаў развіцця
(Л.С. Выготскі)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Стабільныя

- Узросты пераважна плаўнага, часта непрыкметнага ўнутранага змянення асобы дзіцяці, якое здзяйсняецца шляхам нязначных «малекулярных» дасягненняў. На працягу больш-менш працяглага тэрміну, які ахоплівае звычайна некалькі гадоў, не адбываецца якіх-небудзь фундаментальных, рэзкіх асобасных зрухаў і пераменаў;
- Сацыяльная сітуацыя развіцця гарманічная

## Крытычныя

- На працягу адносна кароткага часу сканцэнтраваны рэзкія і капітальныя зрухі і зрушэнні, змены і пераломы асобы дзіцяці. Дзіця змяняецца ў цэлым, у асноўных рысах асобы. Развіццё прымае бурны, імклівы, часам катастрафічны характар, яно нагадвае рэвалюцыйную плынь падзей як па тэмпе змяненняў, што адбываюцца тут, так і па іх сэнсе.
- Сацыяльная сітуацыя развіцця супярэчлівая, канфліктная

**Крызіс (Л.С. Выготскі):**

1) засяроджванне рэзкіх і капітальных зрухаў, змяненняў і пераломаў ў асобе дзіцяці;
2) пераломны пункт у нармальным ходзе псіхічнага развіцця;
3) ланцуг ўнутраных змен дзіцяці пры адносна нязначных знешніх зменах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



# Сутнасць крызісу

**Л.С. Выготскі**

- перабудова ўнутранага перажывання, якое вызначае стаўленне дзіцяці да асяроддзя, змяненне патрэбаў і памкненняў, рухаючых яго паводзінамі, з прычыны ўзнікнення псіхалагічных новаўтварэнняў.

**Л.І. Бажовіч**

- незадавальненне новых патрэбаў дзіцяці, узнікненне якіх абумоўлена асобаснымі новаўтварэннямі адпаведнага ўзроставага перыяду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Прычына крызісу згодна Д.Б. Эльконіну

- Супярэчнасці, якія ўзнікаюць паміж арыентацыямі дзіцяці ў сістэмах адносін **«дзіця - грамадскі прадмет» і «дзіця - грамадскі дарослы».**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ





# Два бакі крызісу

***Разбуральная***

- Уключае ў сябе працэсы згортвання і адмірання, якія сканцэнтраваны пераважна ў крызісных узростах

***Канструктыўная***

- Уключае пазітыўныя змены, якія складаюць галоўны сэнс кожнага пераломнага перыяду

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Асаблівасці праходжання крызісаў развіцца

- **Невыразнасць межаў**, што аддзяляюць пачатак і канец крызісу ад сумежных узростаў. У сярэдзіне крызісу адзначаецца наяўнасць кульмінацыйнай кропкі (папярэдняе ёй паўгоддзе лічыцца пачаткам, а наступнае - заканчэннем крызісу);
- **Цяжкасці ў выхаваўчай сферы** (падзенне паспяховасці, паслабленне цікавасці да школьных заняткаў і агульнае зніжэнне працаздольнасці, больш-менш вострыя канфлікты з навакольнымі; ўнутранае жыццё часам звязана з балючымі і пакутлівымі перажываннямі, з ўнутранымі канфліктамі);
- **Варыятыўнасць** праходжання крызісаў (літычнае і крытычнае цячэнне).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Крызісы развіцця

- Нованароджанасці
- 1-га года
- 3-х гадоў
- 6-7 гадоў
- 10-11 гадоў
- 14-15 гадоў
- 20-23 гадоў
- 30-гадовага ўзросту
- 40-45 гадоў
- 60-65 гадоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Перыядызацыя

## Э.Мейман

| Стадыя | Асаблівасці |
|---|---|
| Фантастычнага сінтэзу, 0-7 гадоў | абагульняюць асобныя адчуванні без якой-небудзь сістэмы і логікі. У выніку атрымлівае паняцці, якія з'яўляюцца «фантастычнымі», мала звязанымі з аб'ектыўнай рэальнасцю |
| Аналіза, 7-12 гадоў | дыферэнцыяцыя, разлажэнне агульных паняццяў, іх расчляненне на часткі, што дазваляе сфарміраваць адэкватнае разуменне аб гэтых частках |
| Разумовага сінтэзу, 12 - 16 гадоў | аперацыйнае мысленне, можа інтэграваць асобныя паняцці, здольны атрымліваць навуковыя ўяўленні пра навакольны свет |

## Ж. Піажэ

| Стадыя | Асаблівасці |
|---|---|
| Сэнсаматорны інтэлект, 0-2 гады | Няма паняццяў, логікі, сродак пазнання – практычныя дзеянні і адчуванні |
| Дааперацыянальны інтэлект, 2-6 гадоў | Эгацэнтрызм, рэалізм, адсутнічае разуменне прынцыпу захавання, няма логікі |
| Канкрэтна-аперацыянальны інтэлект, 6-12 гадоў | Развіваецца логіка, засваенне пэўных паняццяў, зваротныя разумовыя дзеянні, дэцэнтрацыя |
| Фармальна-аперацыянальны інтэлект, 12-16 | Развітая логіка, лёгкасць зварачальнасці думкі, засваенне абстрактных |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Перыядызацыя В.І. Слабодчыкава

| Ступені развіцця суб'ектнасці | Матрыца ўзросту | | | |
|---|---|---|---|---|
| | *Перыяд станаўлення сумеснага быцця* | | *Перыяд рэалізацыі сама-бытнасці* | |
| | *Крызісы «нараджэння»* | *Стадии принятия* | *Крызісы развіцця* | *Стадыі асваення* |
| Ажыўлення | Родавы - 2 мес. - +3 тыдн. | Нованароджанасць 0,5-4 мес. | Нованароджанасці 3,5-7 мес. | Маленства 6-12 мес. |
| Адушаўлення | Маленства 11 мес. - 18 мес. | Ранняе дзяцінства 1,3-3 гадоў | Ранняга дзяцінства 2,5-3,5 гадоў | Дашкольнае дзяцінства 3-6,5 гадоў |
| Персаналізацыі | Дзяцінства 5,5–7,5 гадоў | Малалецтва 7-11,5 гадоў | Малалецтва 11-14 гадоў | Юнацтва 13,5-18 гадоў |
| Індывідуалізацыі | Юнацтва 17-21 гадоў | Маладосць 19-28 гадоў | Маладосці 27-33 гадоў | Дарослаcць 32-42 гадоў |
| Універсалізацыі | Дарослаcці 39-45 гадоў<br>Крызіс індывідуальнага жыцця | Сталасць 44-60 гадоў | Сталасці 55-65 гадоў | Старасць 62 гады і болей |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Перыядызацыя Д.Б. Эльконіна

| Узроставыя эпохі | Раннее детство | | Детство | | Отрочество | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Узроставыя перыяды | Маленства | Ранні ўзрост | Дошкольны ўзрост | Малодшы школьны ўзрост | Падлеткавы ўзрост | Ранняе юнацтва |
| Крызісы развіцця | Нованароджанасць | 1 года | 3 гадоў | 6-7 гадоў | 10-11 гадоў | 14-15 гадоў |
| Сацыяльная сітуацыя развіцця | «МЫ» | Дзіця-ПРАДМЕТ-дарослы | Дзіця-ДАРОСЛЫ; Дзіця-аднагодкі | Дзіця-НАСТАЎНІК; Дзіця-бацькі; Дзіця-аднагодкі | Дзіця-АДНАГОДКІ | «Парог дарослага жыцця» |
| Вядучая дзейнасць | Непасрэдныя эмацыянальныя зносіны | Прадметна-маніпулятыўная | Сюжэтна-ролевая гульня | Вучэбная | Зносіны з аднагодкамі | Вучэбна-прафесійная |
| Пераважная сфера развіцця | М-П | А-Т | М-П | А-Т | М-П | А-Т |
| Псіхалагічныя | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ